Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва

# ВАЙНА ПРАЙШЛА СКРОЗЬ ІХ СЭРЦЫ. ПАМЯЦЬ АБ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЕ Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКІХ ДЗЕЯЧОЎ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА, ЯЕ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ

Мінск, 2026

Вядомаму паэту-асветніку Генрыху Гейнэ прыпісваюць фразу пра тое, што, калі свет расколваецца, створаная рана праходзіць праз сэрца паэта. Другая сусветная вайна стала той гістарычнай падзеяй, што заставіла незагоеную рану на сэрцы ўсяго беларускага народа. Кожны ўдзельнік вайны мог бы выказаць гэта па-свойму. Голасам сацыяльнай памяці нашага грамадства сталі творчыя асобы, у тым ліку тыя, хто прымаў непасрэдны ўдзел у ваенных падзеях, ваяваў у партызанскіх атрадах або на фронце, наведваў перадавую. Іх галасы - не проста сведчанне часу, але і адлюстраванне думак і пачуццяў пакаленняў, што прайшлі праз ваенныя выпрабаванні. Яны дазваляюць зразумець, чым была вайна для людзей той пары, настроі на розных этапах ваенных падзей, а таксама тое, як памяць пра ваенныя гады ўздзейнічала на людзей у будучым.

Першым сведкам з'яўляецца заходнебеларускі паэт Міхась Васілёк (1905 – 1960). Для яго, як і іншых жыхароў Заходняй Беларусі, вайна пачалася 1 верасня 1939 г. Прызваны ў польскае войска, ён трапіў у нямецкі палон, адкуль вярнуўся толькі ў 1941 г. напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Яго вершы з палону адлюстроўваюць жорсткую рэчаіснасць, але ў той жа час - надзею на вяртанне. Фотаздымак з фонда 2 БДАМЛМ дэманструе аблічча 36-гадовага паэта пасля палону. Найбольш эмацыйным сведчаннем пачатку Вяликай Айчыннай папраўу з'яўляецца паэма "Сцяг брыгады" Аркадзя Куляшова (1914 – 1978), за якую ў 1946 г. ён атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР. Паэма часткова адлюстроўвае рэчаісныя ўражанні А. Куляшова падчас эвакуацыі з Мінска. Сведчанні Мікалая Лобана (1911 – 1984) і Антона Алешкі (1913 – 1971) цікавы тым, што зафіксаваны ў іх франтавых дзённіках, захоўваемых у БДАМЛМ.

Дзеяч кінамастацтва Мікола Садковіч (1907 – 1968) і знакамітая оперная спявачка Ларыса Александроўская (1904 – 1980) не прымалі непасрэдны ўдзел у баявых дзеяннях, аднак наведвалі лінію фронта ў сувязі з выкананнем прафесійных абавязкаў. М.Садковіч трымаў у руках кінакамеру. Л.Александроўская спявала для салдат і партызан. Па словах спявачкі: "Мы ў дні вайны бывалі ўсюду разам". Іх дзейнасць падтрымлівала байцоў і ў той жа час сведчыла пра тое, што культура Беларусі, якая ў 1941 - 1944 гг. знаходзілася пад акупацыяй, працягвала жыць і змагацца. Народныя пісьменнікі Іван Навуменка (1925 – 2006) і Васіль Быкаў (1924 – 2003), паэт і перакладчык Аляксей Зарыцкі (1911 – 1987) набылі сваю творчую папулярнасць ужо ў пасляваенны час, але вопыт іх ваеннай маладосці ў значнай ступені вызначыў іх будучы светапогляд. Памяць пра вайну ў іх творах - гэта ў першую чаргу памяць пра трагедыю, перасцярога для нашчадкаў.

Скульптар Сяргей Селіханаў (1917 – 1976) служыў у Чырвонай Арміі з першых дзён і да самога канца Вялікай Айчыннай. У яго творчасці вайна набыла канкрэтнае чалавечае аблічча. Вядома, што ён маляваў партрэты аднапалчан. У БДАМЛМ захоўваецца партрэт "Салдат у санбаце" (1945 г.). У пасляваенны перыяд тэма вайны стала асноўнай у яго творчасці. С. Селіханаў стаў адным з першых савецкіх скульптараў, хто поруч з героіка-эпічнымі кампазіцыямі, ствараў помнікі трагедыі і смутку. Адзін з яго найбольш значных унёскаў у асэнсаванні разбуральнага подыху вайны для чалавецтва - помнікі ахвярам Хатыні (1968), у тым ліку знакамітая скульптура "Непакораны чалавек".

## Паэт, журналіст, партызан
## Міхась Васілёк (Міхаіл Восіпавіч Касцевіч)
## (1905 – 1960)



*«Птушкай падбітай імкнуся*
*Туды, дзе чакае пакутных сыноў*
*Родны прастор Беларусі.*
*Дрот навакол -*
*Людзі чужыя. Як зверы...*
*Ды не зламае дзікі закон*
*У сэрцы надзеі і веры.*
*Нашу вясну*
*Цёмная ноч засланяе...*
*Толькі ў грудзях набалеўшых адну*
*Думку мы песцім, люляем:*
*Прыйдзе яна,*
*Прыйдзе звароту часіна, -*
*Радасць сустрэчы, як чарку, да дна*
*Вып'ем з табою, краіна!»*
1940 г.



# Народны паэт Беларусі
# Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў
# (1914 – 1978)



*«Усяго не апішаш, бо слоў*
*Для ўсяго будзе мала,*
*Як патронаў у нашых байцоў,*
*Як снарадаў не стала.*
*Вораг лезе і лезе, - лезе*
*У брані, у жалезе,*
*Перамогу ён чуе;*
*Каля сцяга стаю і гляжу я.*
*Чым фашыста стрымаць?*
*Людзі гінуць і гінуць.*
*Я не знаю, ці варта пісаць*
*У такую хвіліну?*
*Час прыйшоў...»*

*1943 г.*






Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ПАСВЕДЧАННЕ № 2

Тав. Куляшову Аркадзю Аляксандравічу

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР ад 31 кастрычніка 1968 г. прысвоена ганаровае званне Народнага паэта Беларускай ССР

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

31 кастрычніка 1968 г.

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

УДОСТОВЕРЕНИЕ № 2

Тов. Кулешову Аркадию Александровичу

Указом Президиума Верховного Совета Белорусской ССР от 31 октября 1968 г. присвоено почетное звание Народного поэта Белорусской ССР

31 октября 1968 г.

# Пісьменнік, мовазнавец Мікалай Паўлавіч Лобан (1911 – 1984)









*«Ускочыў, і нешта нябачнае секанула мяне па твары, і галава зазвінела меладычна мільёнам званочкаў. Прытомнасці не губляў і хвіліну-другую стаяў на нагах. Затым падумаў, што гэта я паранены, а калі паранены, то трэба ўпасці».* 1942 г.

# Пісьменнік, ваенны ўрач
# Антон Антонавіч Алешка
# (1913 – 1971)





290

„Я сказал, что истинно мужественный человек должен быть милостивым и милосердечным; именно в этом должно проявляться его мужество".

Лукиан

„Всякая женщина – яд; она благодетельна дважды: или на ложе любви, или на смертном одре"

Паллад.

„Чтобы женщина была красива, надо, говорят испанцы, чтобы она совмещала тридцать „если", или, если угодно, чтобы её можно было определить при помощи десяти прилагательных, применимых каждое к трём частям её особы. Так, три вещи у нее должны быть черные: глаза, веки и брови; три – тонкие: пальцы, губы, волосы и т. д."

„Кармен" Проспер Мериме.





## Кінарэжысёр, аператар, сцэнарыст Мікола (Мікалай Фёдаравіч) Садковіч (1907 – 1968)



*«Жорсткая вайна, якая не ведала ні радасці вясновага абуджэння, ні прыгажосці ціхіх палёў, ні бясконцых дзён ранняй сяўбы, ні хвалюючых паляўнічых зор».*

*1960 г.*



## Народная артыстка СССР і БССР
## Ларыса Пампееўна
## Александроўская
## (1904 – 1980)



ТЭКСТ Л.П. АЛЕКСАНДРОЎСКАЙ

Мы ў днІ вайны
бывалІ ўсюды разам.
Артыст ў баю
суправаджаў байца
Да Брэста І да сІнІх гор
Каўказа
І дальш – да пераможнага
канца!

І не састарацъ
нІ гады,нІ раны
Сяброўства,
гартаванае ў баю.
Прывет вам,
баявыя ветэраны,
І тым,што у воІнскІм
цяпер
страю!





# Народны пісьменнік
# Іван Якаўлевіч Навуменка
# (1925 – 2006)





*«Вайна, а тым болей Айчынная вайна,— падзея, у якую быў уключаны ўвесь народ: яна падпарадкавала сабе ўсе адчуванні савецкіх людзей, усе іх думы і мары».*

*1963 г.*





# Народны пісьменнік Васіль Уладзіміравіч Быкаў (1924 – 2003)



*«Толькі тое і радасці, як падумаеш, што гэтая вайна - ужо апошняя. Даваюем, і баста. Ужо другой такой не будзе. Не павінна быць. Сам я гатовы на ўсё. Але каб апошні раз. Каб дзецям не давялося».*

*1961 г.*



10

ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР — ПРАВЛЕНИЕ СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ БССР

Адрас: Індэкс 220030 Мінск, вул. Энгельса, 9. Тэлефон 22-25-35

№ ______ „21" II 1975 г.

ПАВАЖАНЫ Васіль Уладзіміравіч!

З 27-га лютага па 3 сакавіка 1975 г. у Мінску будзе праходзіць Усесаюзная нарада пісьменнікаў на тэму "Бессмяротны подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне і савецкая літаратура".

Запрашаем Вас на нараду.

Рэгістрацыя і выдача запрашальных білетаў у Саюзе пісьменнікаў 26 лютага 1975 г. з 10 гадзін раніцы.

Просім паведаміць аб Вашым прыездзе.

Адк.сакратар Праўлення СП БССР /А.Вярцінскі/

## Паэт, перакладчык, разведчык
## Аляксей Аляксандравіч Зарыцкі
## (1911 – 1987)

*«Мы там зразумелі*
*З табою як след -*
*У бліндажы,*
*Ля агнёў пераправы,*
*Што воін-герой*
*І сапраўдны паэт*
*Па мужнасці -*
*Родныя сэрца*
*праявы...»*
*1947*







# Паэт, перакладчык, разведчык
# Аляксей Аляксандравіч Зарыцкі
# (1911 – 1987)





(19)

An die Soldaten des Nordabschnittes

Was ist eigentlich wichtig?

Erich Sieger, Grenadier aus der 8. Kompanie des I.R. 484 der 254. I.D., der sich den Russen freiwillig gefangen gab, erzählte uns folgendes: „Die Überlegenheit der Russen an Menschen und Material läßt jetzt keinen Zweifel mehr. Hitler hat diesen Krieg verloren. Und unsere Zeitungen schreiben über den „strategischen Rückzug". Daran glauben nur die Narren. Die denkenden Soldaten sagen so: „Rommel führte auch in Afrika einen „strategischen Rückzug", aber später erwies es sich, daß seine Armee einfach kapituliert hat. So wird es auch in Russland sein. Das ist für jedermann klar!"

Wenn wir schon im Sommer zurückgehen, was wird dann erst im Winter sein?

Viele Soldaten sind ärgerlich über die freche Gewohnheit der nazistischen Zeitungen, die nach der Aufgabe irgendwelcher wichtigen Gebiete oder Städte behaupten, daß diese Aufgabe für Deutschland unwichtig ist.

Man hat uns aus Afrika verjagt. Afrika wurde für Deutschland unwichtig, man hat das Ruhrgebiet zerbombt, es wurde unbedeutend für Deutschland, man treibt uns aus der Ukraine — auch das eine Bagatelle. Ich bin sicher, daß nach der endgültigen Zerstörung Berlins die Nazis erklären werden — diese Stadt ist für Deutschland auch unwichtig. Die Welt hat noch nie so freche Lügen gehört.

Was ist denn eigentlich wichtig für Deutschland?"

Deutsche Soldaten!

Der Sommer 1943 kam heran.

Die Hitlertruppen sind hinter den Dnjepr zu[illegible]den — die Göbbelspropaganda schreit, daß das nicht [illegible] die mächtigen englisch-amerikanischen Armeen [illegible]

Wenden!



Памяці сяброў загінуўшых пад Нарвай

[illegible]

А я часцінька думаю пра іх,

[illegible]

Вось заляглі ў халодных буйных росах.

[illegible]

Ім не пачуць [illegible]

[illegible]

Сцяжыны усе засыпаў снег і вецер,
І сцягі праўдзівыя пахіліліся.

1.VI.42 г.

*«Прытаміўшыся горад, на плошчы нікога.
Толькі зрэдку прамчыцца машына ці крок
Прагучыць пешахода. А Вечны агонь
У прыціхлым паўзмроку палае ярчэй і
ярчэй. Незгасальны агонь - незгасальная
памяць нашых сэрцаў і душ».
1973*

## Народны мастак Беларусі
## Сяргей Іванавіч Селіханаў
## (1917 – 1976)







*1945 г.*



*1950 г.*



*1968 г.*

У віртуальнай выставе выкарыстаны дакументы з фондаў БДАМЛМ:
Фонд 2 Васілёк Міхась (Касцевіч Міхаіл Іосіфавіч), паэт
Фонд 11 Выдавецтва "Беларусь"
Фонд 37 Рэдакцыя часопіса "Маладосць" Саюза беларускіх пісьменнікаў
Фонд 148 Лобан Мікалай Паўлавіч, заслужаны работнік культуры БССР
Фонд 165 Быкаў Васіль Уладзіміравіч, народны пісьменнік Беларусі
Фонд 173 Селіханаў Сяргей Іванавіч, народны мастак БССР
Фонд 208 Алешка Антон Антановіч, пісьменнік
Фонд 316 Аляксандраўская Ларыса Пампееўна, народная артыстка СССР
Фонд 467 Садковіч Мікалай Фёдаравіч, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР
Фонд Аляксея Аляксандравіча Зарыцкага знаходзіцца на стадыі фарміравання